ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
______ 20__ № ____

# АДУКАЦЫЙНЫ СТАНДАРТ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
(АСВА 7-06-0222-02-2022)

## ПАГЛЫБЛЕНАЯ ВЫШЭЙШАЯ АДУКАЦЫЯ
**Спецыяльнасць** 7-06-0222-02 Этналогія
**Ступень** Магістр

## УГЛУБЛЕННОЕ ВЫСШЕЕ ОБРАЗОВАНИЕ
**Специальность** 7-06-0222-02 Этнология
**Степень** Магистр

## ADVANCED HIGHER EDUCATION (MASTER STUDIES)
**Speciality** 7-06-0222-02 Ethnology
**Degree** Master of Arts

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Адукацыйны стандарт паглыбленай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 7-06-0222-02 Этналогія (далей – адукацыйны стандарт) прымяняецца пры распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы магістратуры, вучэбна-метадычнай дакументацыі, вучэбных выданняў, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў.

Дадзены адукацыйны стандарт абавязковы для прымянення ва ўсіх установах вышэйшай адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку па спецыяльнасці 7-06-0222-02 Этналогія.

2. У дадзеным адукацыйным стандарце выкарыстаны спасылкі на наступныя акты заканадаўства:

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 ліпеня 2012 г. № 425-З «О государственной инновационной политике и инновационной деятельности в Республике Беларусь»;

Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 011-2022 «Специальности и квалификации» (далей – АКРБ 011-2022);

Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь АКРБ 005-2011 «Виды экономической деятельности» (далей – АКРБ 005-2011);

СТБ ISO 9000-2015 Сістэмы менеджменту якасці. Асноўныя палажэнні і слоўнік (далей – СТБ ISO 9000-2015).

3. У дадзеным адукацыйным стандарце прымяняюцца тэрміны, вызначаныя ў Кодэксе Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, а таксама наступныя тэрміны з адпаведнымі азначэннямі:

вынікі навучання – веды, уменні і навыкі (досвед), якія магістрант можа прадэманстраваць па завяршэнні вывучэння канкрэтнай вучэбнай дысцыпліны або модуля;

забеспячэнне якасці – частка менеджменту якасці, арыентаваная на прадстаўленне ўпэўненасці ў тым, што патрабаванні да якасці будуць выкананы (СТБ ISO 9000-2015);

інавацыйная дзейнасць – дзейнасць па пераўтварэнні новаўвядзення ў інавацыю;

інавацыя – ўведзеныя ў грамадзянскі абарот або выкарыстоўваемыя для ўласных патрэб новая або ўдасканаленая прадукцыя, новая або ўдасканаленая тэхналогія, новая паслуга, новае арганізацыйна-тэхнічнае рашэнне вытворчага, адміністрацыйнага, камерцыйнага або іншага характару;

кампетэнтнасць – здольнасць прымяняць веды і навыкі для дасягнення намечаных вынікаў (СТБ ISO 9000-2015);

магістарская дысертацыя – самастойна выкананая навукова-даследчая работа, якая мае ўнутранае адзінства, прысвечаная вырашэнню тэарэтычнай, эксперыментальнай або прыкладной задачы адпаведнай сферы прафесійнай дзейнасці, якая сведчыць пра асабісты ўклад аўтара ў навуку і (або) практыку;

паглыбленыя прафесійныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да магістра і якія адлюстроўваюць яго здольнасць вырашаць інавацыйныя задачы прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці з атрыманай спецыяльнасцю;

прафілізацыя – варыянт рэалізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці, абумоўлены асаблівасцямі прафесійнай дзейнасці магістра;

сацыяльна-культурная антрапалогія – навука, якая вывучае культурныя ўніверсаліі і культурныя адрозненні народаў свету;

спецыялізаваныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да магістра і якія адлюстроўваюць яго здольнасць вырашаць спецыялізаваныя інавацыйныя задачы прафесійнай дзейнасці з улікам прафілізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці ва ўстанове вышэйшай адукацыі;

спецыяльнасць – комплекс або паслядоўнасць відаў прафесійнай дзейнасці, спланаванай і арганізаванай для дасягнення мэт навучання на працягу бесперапыннага (працяглага) прамежку часу і ўключэння выпускніка

установы адукацыі ў вызначаныя віды эканамічнай дзейнасці на падставе атрыманай кваліфікацыі (АКРБ 011-2022);

універсальныя кампетэнцыі – кампетэнцыі, якія фарміруюцца ў адпаведнасці з патрабаваннямі да магістра і якія адлюстроўваюць яго здольнасць прымяняць паглыбленыя навукова-тэарэтычныя, метадалагічныя веды і даследчыя ўменні, а таксама сацыяльна-асобасныя якасці, якія адпавядаюць запытам дзяржавы і грамадства;

этналогія – навука, якая вывучае народы-этнасы, іх паходжанне, культуру, базіруючыся пераважна на дадзеных палявых этнаграфічных даследаванняў.

4. Спецыяльнасць 7-06-0222-02 Этналогія ў адпаведнасці з АКРБ 011-2022 адносіцца да профілю адукацыі 02 Мастацтва і гуманітарныя навукі, напрамку адукацыі 022 Гуманітарныя навукі (акрамя моў) і забяспечвае атрыманне ступені магістра.

5. Навучанне па спецыяльнасці прадугледжвае наступныя формы атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі: вочная (дзённая, вячэрняя), завочная, дыстанцыйная.

6. Асноўнымі відамі прафесійнай дзейнасці магістра ў адпаведнасці з АКРБ 005-2011 з’яўляюцца:

72 Навуковыя даследаванні і распрацоўкі;

74909 Іншая прафесійная, навуковая і тэхнічная дзейнасць;

854 Вышэйшая і паслясярэдняя адукацыя;

856 Дапаможныя адукацыйныя паслугі;

91 Дзейнасць бібліятэк, архіваў, музеяў і іншая дзейнасць у галіне культуры.

Магістр можа ажыццяўляць іншыя віды прафесійнай дзейнасці пры ўмове адпаведнасці ўзроўню яго адукацыі і набытых кампетэнцый патрабаванням да кваліфікацыі працаўніка.

## ГЛАВА 2
## ПАТРАБАВАННІ ДА ТЭРМІНАЎ АТРЫМАННЯ ПАГЛЫБЛЕНАЙ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

7. Тэрмін атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме складае 1 год.

Тэрмін атрымання паглыбленай вышэйшай адукацыі ў вячэрняй форме складае 1,5 года, у завочнай форме складае 1,5 года, у дыстанцыйнай форме складае 1,5 года.

8. Працаёмістасць адукацыйнай праграмы магістратуры складае 60 заліковых адзінак.

Сума заліковых адзінак за 1 год навучання пры атрыманні паглыбленай вышэйшай адукацыі ў дзённай форме навучання складае 60

заліковых адзінак, пры навучанні па індывідуальным вучэбным плане – не больш за 75 заліковых адзінак. Пры атрыманні паглыбленай вышэйшай адукацыі ў вячэрняй, завочнай і дыстанцыйнай формах сума заліковых адзінак за 1 год навучання, як правіла, не перавышае 60 заліковых адзінак.

## ГЛАВА 3
## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ЗАСВАЕННЯ ЗМЕСТУ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ МАГІСТРАТУРЫ

9. Магістр, які засвоіў змест адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці 7-06-0222-02 Этналогія, павінен валодаць універсальнымі, паглыбленымі прафесійнымі і спецыялізаванымі кампетэнцыямі.

10. Магістр павінен валодаць наступнымі ўніверсальнымі кампетэнцыямі (далей – УК):

УК-1 Прымяняць метады навуковага пазнання ў даследчай дзейнасці, генерыраваць і рэалізоўваць інавацыйныя ідэі;

УК-2 Вырашаць навукова-даследчыя і інавацыйныя задачы на аснове прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій;

УК-3 Ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове ў акадэмічным, навуковым і прафесійным асяроддзі для рэалізацыі навукова-даследчай і прафесійнай дзейнасці;

УК-4 Забяспечваць камунікацыі, праяўляць лідарскія навыкі, быць здольным да камандаўтварэння і распрацоўкі стратэгічных мэт і задач;

УК-5 Развіваць інавацыйную ўспрымальнасць і здольнасць да інавацыйнай дзейнасці;

УК-6 Быць здольным да прагназавання ўмоў рэалізацыі прафесійнай дзейнасці і вырашэння прафесійных задач ва ўмовах нявызначанасці;

УК-7 Прымяняць псіхолага-педагагічныя метады і інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі ў адукацыі і кіраванні;

УК-8 Вырашаць практычныя задачы, творча асэнсоўваць інфармацыю аб культуры, міжкультурных камунікацыях і этнічных працэсах у сучасным свеце.

11. Магістр павінен валодаць наступнымі паглыбленымі прафесійнымі кампетэнцыямі (далей – ППК):

ППК-1. Валодаць асноўнымі тэарэтычнымі пытаннямі этналогіі і інтэрпрэтаваць іх у прафесійнай дзейнасці;

ППК-2. Інтэрпрэтаваць фундаментальныя культурныя ўніверсаліі і адрозненні грамадства на лакальным і рэгіянальным узроўнях;

ППК-3. Абагульняць і сістэматызаваць этналагічную і антрапалагічную інфармацыю, ставіць мэты этналагічнага даследавання і выбіраць аптымальныя шляхі і метады іх дасягнення;

ППК-4. Распрацоўваць новыя метады этналагічнага даследавання, змяняць навуковы профіль дзейнасці, весці інавацыйную навукова-адукацыйную дзейнасць, спараджаць інавацыйныя ідэі, вылучаць самастойныя гіпотэзы ў галіне этналогіі і сацыяльна-культурнай антрапалогіі.

12. Пры распрацоўцы зместу адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці на аснове дадзенага адукацыйнага стандарта ўсе УК і ППК уключаюцца ў набор патрабуемых вынікаў засваення зместу адукацыйнай праграмы магістратуры ў адпаведнасці з дадзеным адукацыйным стандартам.

13. Пры распрацоўцы зместу адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці ўстанова вышэйшай адукацыі прафілізуе адукацыйную праграму магістратуры з улікам тэматыкі даследаванняў і распрацовак арганізацый, якія маюць патрэбу ў падрыхтоўцы магістраў.

Найменне прафілізацыі вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі самастойна і можа ўключацца ў найменні прыкладнага вучэбнага плана па спецыяльнасці, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці.

14. Пералік вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам УК можа быць дапоўнены ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам прафілізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці, асаблівасцей прафесійнай дзейнасці будучага магістра.

Пералік спецыялізаваных кампетэнцый установа вышэйшай адукацыі вызначае самастойна з улікам прафілізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці, асаблівасцей прафесійнай дзейнасці будучага магістра.

Дадатковыя УК і спецыялізаваныя кампетэнцыі вызначаюцца на аснове патрабаванняў рынку працы, абагульнення замежнага вопыту, правядзення кансультацый з арганізацыямі, якія маюць патрэбу ў падрыхтоўцы магістраў, іншых крыніц.

Сукупнасць вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам УК і ППК, а таксама вызначаных установай вышэйшай адукацыі дадатковых УК і спецыялізаваных кампетэнцый, павінна забяспечваць магістру здольнасць ажыццяўляць не менш чым адзін від прафесійнай дзейнасці, вызначаны ў пункце 6 дадзенага адукацыйнага стандарта.

## ГЛАВА 4
## ПАТРАБАВАННІ ДА ЗМЕСТУ ВУЧЭБНА_ПРАГРАМНАЙ ДАКУМЕНТАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАЙ ПРАГРАМЫ МАГІСТРАТУРЫ

15. Вучэбны план установы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці распрацоўваецца ў адпаведнасці са структурай, прыведзенай у табліцы 1.

Табліца 1

| № п/п | Найменне відаў дзейнасці асобы, якая навучаецца, модуляў, вучэбных дысцыплін | Працаёмістасць (у залiковых адзiнках) |
|---|---|---|
| **1.** | **Тэарэтычнае навучанне** | **36-45** |
| 1.1. | Дзяржаўны кампанент: модуль “Тэарэтычныя пытанні этналогіі і антрапалогіі” (Сучасныя этнічныя працэсы, Сацыякультурная антрапалогія, Тэорыя і практыка аховы гісторыка-культурнай спадчыны); модуль “Навукова-даследчая работа” (Даследчы семінар, Гістарыяграфія, крыніцы і метады этналагічных даследаванняў) | 9-15 |
| 1.2. | Кампанент установы вышэйшай адукацыі | 24-34 |
| **2.** | **Вытворчая практыка** | **3-6** |
| **3.** | **Магістарская дысертацыя** | **12-18** |
| | **Усяго** | **60** |

16. Максімальны аб’ём вучэбнай нагрузкі магістранта не павінен перавышаць 54 акадэмічныя гадзіны ў тыдзень, уключаючы ўсе віды аўдыторнай і пазааўдыторнай работы, акрамя дадатковых відаў навучання.

Аб’ём абавязковых аўдыторных заняткаў, які вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам спецыяльнасці, спецыфікі арганізацыі адукацыйнага працэсу, абсталявання вучэбна-лабараторнай базы, інфармацыйнага, навукова-метадычнага забеспячэння, вызначаецца ў межах 16–24 аўдыторных гадзін у тыдзень. Для магістрантаў з ліку замежных грамадзян аб’ём аўдыторных заняткаў можа быць павялічаны ўстановай вышэйшай адукацыі.

У гадзіны, якія адводзяцца на самастойную работу па вучэбнай дысцыпліне, модулі, уключаецца час, прадугледжаны на падрыхтоўку да экзамену (экзаменаў) і (або) заліку (залікаў) па дадзенай вучэбнай дысцыпліне, модулі.

17. Размеркаванне працаёмістасці паміж асобнымі модулямі і вучэбнымі дысцыплінамі дзяржаўнага кампанента, а таксама асобнымі відамі вытворчай практыкі ажыццяўляецца ўстановай вышэйшай адукацыі.

18. Вывучэнне агульнаадукацыйных дысцыплін «Філасофія і метадалогія навукі», «Замежная мова», «Асновы інфармацыйных тэхналогій» павінна забяспечваць фарміраванне, адпаведна, наступных кампетэнцый: прымяняць метады навуковага пазнання ў даследчай дзейнасці, генерыраваць і рэалізоўваць інавацыйныя ідэі; ажыццяўляць камунікацыі на замежнай мове ў акадэмічным, навуковым і прафесійным

асяроддзі для рэалізацыі навукова-даследчай і інавацыйнай дзейнасці; вырашаць навукова-даследчыя і інавацыйныя задачы на аснове прымянення інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Колькасць гадзін на вывучэнне агульнаадукацыйных дысцыплін плануецца ў адпаведнасці з праграмамі-мінімумамі кандыдацкіх экзаменаў і кандыдацкіх дыферэнцыраваных залікаў па агульнаадукацыйных дысцыплінах, зацверджанымі Міністэрствам адукацыі. Агульнаадукацыйныя дысцыпліны ўключаюцца ў пералік вучэбных дысцыплін цыклу «Дадатковыя віды навучання» вучэбнага плана.

Пералік вучэбных дысцыплін модуля «Дадатковыя віды навучання», якія асвойвае магістрант, вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі.

19. Вытворчая практыка накіравана на замацаванне ведаў і ўменняў, якія атрыманы ў працэсе тэарэтычнага навучання ў магістратуры, авалоданне навыкамі даследавання актуальных навуковых і прыкладных праблем, рашэння сацыяльна-прафесійных задач, прымяненне інавацыйных тэхналогій і іншае.

Від вытворчай практыкі вызначаецца ўстановай вышэйшай адукацыі з улікам прафілізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры і відаў дзейнасці, на якія арыентавана адукацыйная праграма магістратуры. Практыкі ў межах адной спецыяльнасці магістратуры могуць мець розныя мэты і задачы (напрыклад, педагагічная, навукова-даследчая, палявая этнаграфічная).

20. Працаёмістасць кожнай вучэбнай дысцыпліны павінна складаць не менш за тры заліковыя адзінкі. Адпаведна, працаёмістасць кожнага модуля павінна складаць не менш за шэсць заліковых адзінак.

21. Пры распрацоўцы вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці рэкамендуецца прадугледжваць у рамках кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі модулі і вучэбныя дысцыпліны па выбары магістранта ў аб’ёме не менш за 20 працэнтаў ад кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі.

22. Індывідуальны план работы магістранта распрацоўваецца навуковым кіраўніком магістранта сумесна з магістрантам, абмяркоўваецца на пасяджэнні прафіліруючай (выпускаючай) кафедры.

Індывідуальны план работы магістранта распрацоўваецца на падставе вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па адпаведнай спецыяльнасці паглыбленай вышэйшай адукацыі, уключае праграму падрыхтоўкі магістарскай дысертацыі і кантрольныя мерапрыемствы.

23. Патрабаванні да зместу навукова-даследчай работы распрацоўваюцца профільнай (выпускаючай) кафедрай.

Падчас выканання навукова-даследчай работы ў магістрантаў фармуюцца навыкі:

абагульнення і крытычнага аналізу вынікаў, атрыманых айчыннымі і замежнымі навукоўцамі, выяўлення і фармулявання актуальных навуковых праблем і мэт даследавання;

абгрунтавання актуальнасці, тэарэтычнай і практычнай значнасці тэмы навуковага даследавання, распрацоўкі плана і праграмы правядзення навуковага даследавання;

правядзення самастойнага даследавання з выкарыстаннем сучасных метадаў і тэхналогій у адпаведнасці з распрацаванай праграмай;

распрацоўкі мадэляў даследуемых працэсаў, з’яў і аб’ектаў (выбар або мадыфікацыя існуючых мадэляў);

выбару метадаў і сродкаў распрацоўкі інструментарыя эмпірычнага даследавання, збору, апрацоўкі, аналізу, ацэнкі і інтэрпрэтацыі атрыманых вынікаў даследавання;

самастойнага правядзення бібліяграфічнай работы з прыцягненнем сучасных інфармацыйных тэхналогій;

прадстаўлення вынікаў праведзенага даследавання ў выглядзе навуковай справаздачы, артыкула, даклада, мадэлі, макета, праграмнага прадукту, патэнта, магістэрскай дысертацыі, заяўкі на грант і іншага.

Змест навукова-даследчай работы магістранта вызначаецца навуковым кіраўніком ў адпаведнасці з прафілізацыяй адукацыйнай праграмы магістратуры, тэматыкай яго навуковага даследавання і замацоўваецца ў індывідуальным плане работы магістранта.

Змест навукова-даследчай работы магістранта прадугледжвае выкананне наступных відаў работ:

выкананне ўсіх відаў навукова-даследчых работ, якія ажыццяўляюцца на адпаведнай базе;

удзел у навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, круглых сталах, дыскусіях;

удзел у конкурсах навукова-даследчых работ;

ажыццяўленне самастойнага даследавання па тэме магістарскай дысертацыі.

Пералік форм ажыццяўлення навукова-даследчай работы канкрэтызуецца і дапаўняецца ў залежнасці ад прафілізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры, асаблівасцей прафесійнай дзейнасці будучага магістра.

24. Коды УК і ППК, фарміраванне якіх забяспечваюць модулі і вучэбныя дысцыпліны дзяржаўнага кампанента, пазначаны ў табліцы 2.

Табліца 2

| № п/п | Найменне модулей, вучэбных дысцыплін | Коды формируемых компетенций |
|---|---|---|
| **1.** | **Модуль «Тэарэтычныя пытанні этналогіі і антрапалогіі»** | **УК-2–4, 6, 8; ППК-1, 2** |

| | | |
|---|---|---|
| 1.1 | Сучасныя этнічныя працэсы | |
| 1.2 | Сацыякультурная антрапалогія | |
| 1.3 | Тэорыя і практыка аховы гісторыка-культурнай спадчыны | |
| **2.** | **Модуль «Навукова-даследчая работа** | **УК-1,5,7; ППК-3, 4** |
| 2.1 | Даследчы семінар | |
| 2.2 | Гістарыяграфія, крыніцы і метады этналагічных даследаванняў | |

25. Вынікі навучання па вучэбных дысцыплінах, модулях (ведаць, умець, мець навык) вызначаюцца вучэбнымі праграмамі.

26. У прыкладных вучэбных праграмах па вучэбных дысцыплінах, модулях прыводзіцца прыкладны пералік вынікаў навучання.

27. Вынікі навучання павінны быць суаднесены з патрабаванымі вынікамі засваення зместу адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці (кампетэнцыямі).

28. Сукупнасць запланаваных вынікаў навучання павінна забяспечваць выпускніку фарміраванне УК і ППК, вызначаных дадзеным адукацыйным стандартам, а таксама дадатковых УК і спецыялізаваных кампетэнцый, вызначаных установай вышэйшай адукацыі самастойна.

## ГЛАВА 5
## ПАТРАБАВАННІ ДА АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

29. Педагагічныя работнікі, якія забяспечваюць рэалізацыю адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці, павінны:

займацца навуковай і (або) метадычнай дзейнасцю;

валодаць сучаснымі адукацыйнымі, у тым ліку інфармацыйнымі, тэхналогіямі, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага і навукова-даследчага працэсаў;

валодаць асобаснымі якасцямі і кампетэнцыямі, якія дазваляюць эфектыўна арганізоўваць вучэбную і выхаваўчую работу з магістрантамі.

Кіраўніцтва магістэрскімі дысертацыямі могуць ажыццяўляць педагагічныя работнікі, якія маюць вучоную ступень і (або) вучонае званне.

Для ажыццяўлення адукацыйнага працэсу могуць прыцягвацца спецыялісты рэальнага сектара эканомікі, дзейнасць якіх звязана са спецыяльнасцю магістратуры, у адпаведнасці з заканадаўствам.

Педагагічныя работнікі, якія маюць вучоную ступень і (або) вучонае званне, павінны складаць не менш за 60 працэнтаў ад агульнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці.

Доля штатных педагагічных работнікаў, якія забяспечваюць рэалізацыю адукацыйнай праграмы магістратуры, для якіх дадзеная ўстанова вышэйшай адукацыі або яе арганізацыя-заснавальнік з’яўляецца асноўным месцам працы, павінна складаць не менш за 60 працэнтаў ад агульнай колькасці прафесарска-выкладчыцкага складу.

30. Установа вышэйшай адукацыі павінна мець:

матэрыяльна-тэхнічную базу, неабходную для арганізацыі адукацыйнага працэсу, самастойнай работы і развіцця асобы магістранта;

сродкі навучання, неабходныя для рэалізацыі адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці (прыборы, абсталяванне, інструменты, вучэбна-наглядныя дапаможнікі, камп’ютары, камп’ютарныя сеткі, аўдыёвізуальныя сродкі і іншыя матэрыяльныя аб’екты).

Функцыянаванне інфармацыйна-адукацыйнага асяроддзя ўстановы вышэйшай адукацыі забяспечваецца адпаведнымі сродкамі інфармацыйна- камунікацыйных тэхналогій і павінна адпавядаць заканадаўству.

Магістранты з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця павінны быць забяспечаны адаптаванымі друкаванымі і (або) электроннымі адукацыйнымі рэсурсамі.

31. Навукова-метадычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу павінна адпавядаць наступным патрабаванням:

вучэбныя дысцыпліны, модулі павінны быць забяспечаны сучаснай вучэбнай, навуковай, іншай літаратурай, вучэбнымі праграмамі, вучэбна-метадычнай дакументацыяй, інфармацыйна-аналітычнымі матэрыяламі, у тым ліку ў электронным выглядзе;

павінен быць забяспечаны доступ для кожнага магістранта да бібліятэчных фондаў, электронных сродкаў навучання, электронных інфармацыйных рэсурсаў (лакальнага доступу, аддаленага доступу) па ўсіх вучэбных дысцыплінах, модулях.

Навукова-метадычнае забеспячэнне павінна быць арыентавана на распрацоўку і ўкараненне ў адукацыйны працэс інавацыйных адукацыйных тэхналогій, адэкватных кампетэнтнаснаму падыходу (крэатыўнага і дыялогавага навучання, варыятыўных мадэляў самастойнай работы, модульных і рэйтынгавых сістэм навучання, тэставых і іншых сістэм ацэньвання ўзроўню кампетэнцый і іншае).

Абавязковым элементам навукова-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу з’яўляецца размешчаны на афіцыйным сайце ўстановы вышэйшай адукацыі ў глабальнай камп’ютарнай сетцы Інтэрнэт каталог вучэбных дысцыплін, модуляў, які адпавядае наступным патрабаванням:

уключае ў сябе зручную ў выкарыстанні і актуальную інфармацыю, даступную для абітурыентаў на этапе ўступнай кампаніі і для магістрантаў на працягу ўсяго перыяду навучання;

прадстаўляецца на рускай і (або) беларускай мове і англійскай мове;

апісанне кожнай вучэбнай дысцыпліны, модуля змяшчае кароткі змест, фарміруемыя кампетэнцыі, вынікі навучання (ведаць, умець, мець навык), семестр, перадрэквізіты, працаёмістасць у заліковых адзінках (крэдытах), колькасць аўдыторных гадзін і самастойнай работы, патрабаванні да бягучай і прамежкавай атэстацыі і яе формы;

аб’ём апісання кожнай вучэбнай дысцыпліны, модуля складае максімум адну старонку;

каталог вучэбных дысцыплін, модуляў суправаджаецца структурнай (структурна-лагічнай) схемай адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці з заліковымі адзінкамі.

Установы вышэйшай адукацыі маюць права самастойна прымаць рашэнне аб фармаце каталога вучэбных дысцыплін, модуляў і паслядоўнасці прадстаўлення інфармацыі.

32. Патрабаванні да арганізацыі самастойнай работы вызначаюцца заканадаўствам.

33. Патрабаванні да арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы вызначаюцца ў адпаведнасці з рэкамендацыямі па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах вышэйшай адукацыі і праграмна- плануючай дакументацыяй выхавання.

34. Канкрэтныя формы і працэдуры бягучай і прамежкавай атэстацыі па кожнай вучэбнай дысцыпліне распрацоўваюцца адпаведнай кафедрай установы вышэйшай адукацыі і адлюстроўваюцца ў вучэбных праграмах установы адукацыі па вучэбных дысцыплінах, модулях.

Для забеспячэння бягучай і прамежкавай атэстацыі магістрантаў ствараюцца фонды ацэначных сродкаў, якія ўключаюць тыпавыя заданні, заданні адкрытага тыпу, заданні камунікатыўнага тыпу, кантрольныя работы, тэсты, комплексныя кваліфікацыйныя заданні, тэматыку курсавых работ, метадычныя распрацоўкі па інавацыйных формах навучання і кантролю за фарміраваннем кампетэнцый, тэматыку і прынцыпы складання эсэ, формы анкет для правядзення самаацэнкі кампетэнцый магістрантаў і іншае. Фонды ацэначных сродкаў распрацоўваюцца адпаведнымі кафедрамі ўстановы вышэйшай адукацыі.

Ацэначнымі сродкамі павінна прадугледжвацца ацэнка здольнасці магістрантаў весці пошук вырашэння новых задач, звязаных з недастатковасцю канкрэтных спецыяльных ведаў і адсутнасцю агульнапрынятых алгарытмаў.

## ГЛАВА 6
## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКОВАЙ АТЭСТАЦЫІ

35. Выніковая атэстацыя ажыццяўляецца дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй.

Да выніковай атэстацыі дапускаюцца магістранты, якія цалкам выканалі адпаведныя вучэбны план і вучэбныя праграмы.

Выніковая атэстацыя магістрантаў пры засваенні адукацыйнай праграмы магістратуры па спецыяльнасці 7-06-0222-02 Этналогія праводзіцца ў форме абароны магістарскай дысертацыі.

Пры падрыхтоўцы да выніковай атэстацыі фарміруюцца або развіваюцца кампетэнцыі, прыведзеныя ў табліцы 2 дадзенага адукацыйнага стандарта.

36. Выніковая атэстацыя пры завяршэнні асваення зместу адукацыйнай праграмы магістратуры дазваляе вызначыць тэарэтычную і практычную гатоўнасць выпускніка магістратуры да навукова-даследчай, навукова-педагагічнай і вучэбна-метадычнай, аналітычнай, экспертна-кансультацыйнай і інавацыйнай дзейнасці і асваення адукацыйнай праграмы аспірантуры, якая забяспечвае прысваенне кваліфікацыі «Даследчык».

37. Праграма дзяржаўнага экзамену распрацоўваецца ўстановай вышэйшай адукацыі ў адпаведнасці з Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

38. Патрабаванні да структуры, зместу і аб’ёму магістарскай дысертацыі вызначаюцца ўстановай вышэйшай адукацыі на аснове дадзенага адукацыйнага стандарта і Правілаў правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі.

Пры падрыхтоўцы магістарскай дысертацыі магістрант павінен прадэманстраваць, абапіраючыся на атрыманыя веды і сфарміраваныя УК, ППК і спецыялізаваныя кампетэнцыі, уменне вырашаць на сучасным узроўні задачы прафесійнай дзейнасці, здольнасць інтэграваць навуковыя веды, навукова аргументаваць свой пункт гледжання.

Магістарская дысертацыя пры завяршэнні засваення зместу адукацыйнай праграмы магістратуры павінна быць накіравана на вырашэнне тэарэтычнай, эксперыментальнай або прыкладной задачы, звязанай з этналогіяй і (або) сацыяльна-культурнай антрапалогіяй.

Магістарская дысертацыя павінна ўтрымліваць рэфератыўную частку і навукова-даследчую частку, якая адлюстроўвае ППК і спецыялізаваныя кампетэнцыі магістра ў адпаведнасці са спецыяльнасцю падрыхтоўкі. Навукова-даследчая частка павінна складаць не менш за 50 працэнтаў аб’ёму дысертацыі.

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
А.Д.Кароль

___ ___ 2022

Старшыня ВМА па гуманітарнай адукацыі
А.Г.Прахарэнка

___ ___ 2022

Кіраўнік калектыву распрацоўшчыкаў адукацыйнага стандарта

Загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
Т.А.Навагродскі

___ ___ 2022

Члены калектыву распрацоўшчыкаў адукацыйнага стандарта

Загадчык адзела народазнаўства Дзяржаўнай навуковай установы «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»
А.У.Гурко

___ ___ 2022

Дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
І.С.Махоўская

___ ___ 2022

Дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
М.А.Міхайлец

___ ___ 2022

Дацэнт кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў
І.У.Алюніна

___ ___ 2022

Рэктар Дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»
Ю.П.Бондар

___ ___ 2022